Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 9. Варыянт 7. Ч.2**

## Білет № 9. Практычнае заданне. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

**Заданні склаў**: Бернат І.П. ДУА"Гімназія № 36 г. Мінска".

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Выкарыстоўваючы карту, назавіце Мемарыяльныя комплексы, якія размешчаны ў вашым рэгіёне.
2. Якія формы памяці аб падзеях і ўдзельніках Вялікай Айчыннай вайны існуюць у Беларусі?
3. Чаму Хатынь лічыцца сімвалам трагедыі беларускага народа ў гады вайны, а Курган Славы - гэта «сакральны сімвал незалежнасці і свабоды». Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі з крыніц.
4. «Няма ў Беларусі такога кутка, які не стаў бы месцам здзяйснення народнага подзвігу. І няма месца, дзе б не шанавалі гэты подзвіг». Якія факты ў прыведзеных крыніцах пацвярджаюць гэтае меркаванне?

**Крыніца I. ЗДыдактычнага дапаможніка «(Не)забытыя ахвяры вайны» (аўтары: І. Бернат і інш.)**

5 ліпеня 1969 г. недалёка ад Мінска былі адкрыты адразу два мемарыялы. Адзін - героям, другі - ахвярам Другой сусветнай вайны ў Беларусі. Больш за 50 гадоў «Хатынь» і «Курган Славы» нагадваюць вось ужо трэцяму пакаленню беларусаў аб тым, якім коштам была здабытая свабода і нашае права на жыццё.

Хатынь стала помнікам усім спаленым у гады Вялікай Айчыннай вайны 628 вёскам Беларусі…

І калі Хатынь нагадвае аб ахвярах, то "Курган Славы" шануе памяць аб героях, якія здабывалі перамогу над нацызмам. У ліпені 1944 г. падчас наступальнай аперацыі «Баграціён» савецкае войска ўзяло ў асяроддзе 105-тысячнае нямецкае войска, атрымаўшы над імі безумоўную перамогу. У гонар гэтай падзеі ў 1967 г. пачалося ўзвядзенне "Кургана Славы": людзі лічылі за гонар прынесці жменю зямлі для стварэння агульнанароднага манумента. Да яго падножжа вядзе 241 приступка, прайшоўшы якую, чалавек аддае даніну памяці тым, хто ваяваў за сваю Радзіму.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца II.**

## Мемарыяльныя комплексы і помнікі па ўшанаванні падзей Вялікай Айчыннай вайны ў Рэспубліцы Беларусь




**Крыніца III.**

**29 чэрвеня 2019 г. у Мінску на месцы масавых растрэлаў ваенных гадоў быў адкрыты мемарыял «Благоўшчына», які стаў часткай вялікага мемарыяльнага комплексу «Малы Трасцянец».**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

«Имея уникальную возможность знать правду той войны из рассказов очевидцев, главное, что мы должны сделать, - сохранить эту правду, не допустить возрождения страшного прошлого. Ведь история жестоким образом показала, что нельзя игнорировать зло, даже существующее на стадии идеи. Его трансформация в реальную угрозу в таком случае - просто вопрос времени. Мы - представители разных народов, вероисповеданий, жители разных государств, политики и общественные деятели - находимся здесь, потому что помним трагические уроки общей истории. И то, что мы сегодня об этом говорим, - это залог того, что мы научились извлекать уроки из истории. Никогда больше не должна повториться в мире трагедия, поставившая под угрозу существование человечества».

Президент Республики Беларусь Александр Лукашенко